основ «Один Пояс, один путь» для достижения сближения мнений народа // Гуанмин Дейли Газета. – 22.04.2019).

3. 人民网. 推动中白合作提质升级 共同造福两国人民——访中国驻白俄罗斯大使谢小用Народное Интернет-издание КНР. Содействие улучшению и усовершенствованию сотрудничества между Китаем и Беларусью в интересах народов двух стран – беседа с послом КНР в Беларуси Ся Сяоян [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://world.people.com.cn/n1/2023/0830/c1002-40067004.html. – Дата доступа: 30.08.2023.

# АСАБЛІВАСЦІ ЗМЕНЫ ПЕРЫЯДАЎ УЗРОСТУ ДЗЯЦЕЙ У КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ Ў ТРАДЫЦЫЙНЫХ УЯЎЛЕННЯХ БЕЛАРУСАЎ

**Шымчук Е. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт
г.Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – к. гіст. н. Чарнякевіч І. С.

Нягледзячы на трансфармацыі сучаснага грамадства, многія базавыя паняцці цяперашняй сацыяльнай сферы грунтуюцца на фенаменах, што склаліся ў рамках традыцыйных культур. Даследаванне пераходных момантаў ад аднаго ўзроставага перыяда да другога ў кантэксце беларускіх традыцый дазволіць нам праліць святло і на цяперашнія працэсы ўзроставых пераходаў.

У традыцыйных уяўленнях беларусаў вылучаюць наступныя ўзроставыя перыяды чалавека ад нарадэння да паўналецця: маленства, дзяцінства, падлеткавы перыяд, юнацтва. Вызначэнню межаў паміж перыядамі людзям дапамагалі рытуальныя дзеянні, што вызначалі перамены і ва ўзрастова-сацыяльным статусе [1, с.52].

У беларусаў пасля абрадаў далучэння дзіцяці да знешняга свету, звязаных з народзінамі і хрышчэннем, вялікае значэнне меў абрад першай стрыжкі валасоў як сімвал пераходу ў другую ўзроставую групу, што адзначаўся са значнай урачыстасцю. Згодна матэрыялам П. В. Шэйна, у Гродзенскай губерні XIX ст. валасы дзецям стрыглі на трэцім годзе. Тады дзіця садзілі на стол і прыгаворвалі: “Дай божа ласкавы, каб ты, сынок (дачушка) ніколі ні зблудзіў і ішоў простай дарожкаю” [2, с.78].

Гэты абрад сімвалізаваў пачатак перыяду маленства (ад 2-3 да 6-8 гадоў), калі адбываецца ўсведамленне свайго полу, прычым у гутарцы дарослых з’яўляюцца такія назвы як “хлопец”, “малец”, “хлапчаня” і “дзяўча”, “дзеўка”, “дзяўчынка”, калі фарміруецца характар, адбываецца актыўнае псіхічнае і фізічнае развіццё, з'яўляюцца парасткі маральнасці. Па традыцыі, ужо ва ўзросце 4-5 гадоў дзеці выконвалі нескладаныя работы па доме: пасвілі птушку, няньчылі малодшых братоў і сясцёр і інш. [1, с.63].

Репозиторий ГрГМУ

Аднак, нягледзячы на размежаванне дзяцей на хлопцаў і дзяўчат, іх вопратка не мела палавых адрозненняў. Да 7 гадоў звычайна дзеці хадзілі ў адных сарочках, і хлопчык ад дзяўчынкі адрозніваўся толькі даўжынёй валасоў. Гулялі яны разам: бегалі, скакалі на палачных «коніках», гулялі ў лялькі, пяклі «блінцы», будавалі пячуркі. Калі ж яны падрасталі, кожны шукаў гульні ў акружэнні свайго полу, хаця характар іх не мяняўся. У канцы маленства дзеці актыўна ўключаюцца ў працоўную дзейнасць сям'і, наглядаюцца першыя размежаванні працы па палавой адзнацы.

Пераход да падлеткавага перыяду ў разглядаемы час не вызначаўся акрэсленымі агульнымі рытуаламі, аднак, у некаторых рэгіёнах даследчыкі адзначаюць абавязковае праколванне вушэй ў дзяўчынак 10-12-гадовага узросту. Гэту аперацыю рабіла маці, удовая бабка ці нетутэйшая жанчына без сведкаў [3, с. 132]. Акрамя таго, ў падлеткавы перяд мяняецца адзенне дзяцей, якое набліжаецца да адзення дарослых, а таксама прычоска. Дзяўчынкі заплятаюць касу, носяць спадніцу, перашытую са старой матчынай. Ім дазваляецца насіць пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі. Дзеці-падлеткі прымаюць пад сваю адказнасць шэраг гаспадарчых функцый. Найбольш пашыранымі становяцца такія найменні, як “падлетак”, “падуростак”, “вырастак”[1, с.68].

Працэс сацыялізацыі падлеткаў традыцыйна ўключаў не толькі перадачу працоўных навыкаў і ведаў, але і дапасаванне да духоўнага свету абшчыны, сям'і, да каштоўнасцей і асноўных паняццяў чалавечага жыцця, паступовае далучэнне да абрадавага і рэлігійнага жыцця вёскі.

Узроставыя межы юнацтва акрэсліваліся заканчэннем палавога выспявання (ад 16-17 да 19-20 гадоў) і набыццём самастойнасці ў выкананні розных жыццёвых функцый. У юнацтве адбываюцца перамены ў адзенні юнакоў і дзяўчат. Згодна са звычаем, іх трэба было апранаць лепш, чым падлеткаў, бо пачынаўся перыяд пошуку сабе пары. У іх з'яўляюцца розныя прадметы туалету і ўпрыгажэнні: пацеркі, пярсцёнкі, завушніцы, люстэрка, парасон і інш. Менавіта юнацтва ў свядомасці чалавека лічыцца найбольш каштоўным узростам, у якім адбываецца росквіт усіх жыццёвых сіл, а таму кожны жадае раней трапіць і затрымацца ў гэтым узросце [1, с.72].

Такім чынам, у традыцыйнай культуры беларусаў XIX – пач. XX стагоддзяў існавалі пэўныя комплексы абрадаў, што суправаджалі пераходы ад адной ўзроставай групы ў наступную. Аднак, рытуальная “насычанасць” гэтых пераходаў неаднародная. Так, калі пераход да маленства суправаджаўся агульнараспаўсюджаным першым пастрыганнем валасоў, то для іншых перыядаў больш характэрна змена ў правах і абавязках, а ўпамінанні аб пераходных абрадах спарадычныя нават для канца XIX стагоддзя.

Літаратура:

1. Ракава, Л. В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л. В.Ракава. – Мінск : Беларус.навука, 2009. – 311 с.

2. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края/ П. В. Шейн. – СПб. :Тип. Имп. Акад наук, 1902. – 535 с.



Репозиторий ГрГМУ

3. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 307 с.

# ВОДА НА КАВКАЗЕ – МАГИЧЕСКОЕ ЛЕКАРСТВО ПРИРОДЫ

**Эльбуздукаев М. Р.**

Белорусский государственный медицинский университет
г. Минск, Республика Беларусь
Научный руководитель – Будько М. Е.

Вода является неотъемлемой частью жизни на Земле. Издревле она служила источником жизни и здоровья для людей. Но кавказская вода обладает особой силой и значимостью: она считается настоящим лекарством природы.

Кавказ известен своими горными ландшафтами и многочисленными реками. Благодаря особым климатическим условиям и горным стокам, вода на Кавказе богата минералами и природными веществами. Уникальный состав, которым обладает эта вода, является ключевым фактором ее целебных свойств.

Кавказские народы сотни лет назад обнаружили целебные свойства воды и начали использовать ее в лечебных целях. Они верили, что вода имеет способность снимать усталость, восстанавливать силы и оказывать общее оздоровительное действие. Однако причина целебности воды на Кавказе не так проста.

На протяжении долгих лет местные народы заметили, что определенные источники воды обладают уникальными свойствами. Кавказские минеральные воды, такие как нарзан, боржоми, мацеста и др., давно считаются ценным средством в лечении различного рода заболеваний. Они содержат уникальный состав полезных минералов и эффективно воздействуют на организм. Например, нарзан известен своим общеукрепляющим и желудочно-кишечным действием, а боржоми помогает улучшить обмен веществ и нормализовать функцию желудочно-кишечного тракта.

На Кавказе также существует традиция лечения с использованием целебных источников. Некоторые источники воды проходят различные процедуры: их нагревают, фильтруют и придают им специфический состав и вкус.

Кроме того, вода на Кавказе имеет не только физическое, но и эмоциональное значение. Местные жители и гости могут проникнуться атмосферой природного источника и почувствовать единство с природой. Вода на Кавказе стала не только лекарством, но и источником духовной гармонии и внутреннего покоя.

Таким образом, вода на Кавказе является уникальным лекарством, которое обладает не только физическими, но и эмоциональными свойствами. Загадочность и уникальность ее состава делают ее особенно ценной в местной культуре. Поэтому традиция использования воды в лечении на Кавказе

Репозиторий ГрГМУ